Oplata pocztowa uiszczona ryczałtem.

БЕЛАРУСКІ ЗВОН

Радыкальная тыднёвая часопісь.

Цана асобнага нумару 20 гр.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Ліпоўка 18.

Адрэс для карэспандэнцыі і падпіскі: паштовая скрынка № 19.

ПРЫЙМО ІНТЭРЭСАНТАЎ ад 10 да 2 гадз. што-дня, апрача сьвятаў і нядзель.

Падпіска з дастаўкай да хаты: на 1 год — 6 зл., за паўгоду — 3 зл., за 3 мес. — 2 зл., за 1 мес. — 50 гр.

Год I. | Вільня 27 траўня 1931 г. | № 12

Да эканамічнае незалежнасьці.

Беларусы пад Польшчай знаходзяцца ў нязвычайна цяжкім палажэньні ня толькі затым, што яны блага арганізаваныя, жруць адны адных і часта служаць — сьведама ці нясьведама — сваім уласным ворагам, але і затым, што ўсе іхнія культурныя здабыткі, заваяваныя доўгай і ўпорлівай барацьбой, залежаць не ад культурных-жа дзяржаўных установаў і ўрадаў, а — *ад чыста палітычных*. У выніку гэтага, пры зьменнасьці палітычных настрояў сярод „паноў палажэньня“ ў Польшчы, гэныя культурныя здабыткі, утрымліваныя пры невялічкай, часамі проста жабрацкай дапамозе з дзяржаўнага скарбу, усьцяж знаходзяцца над пагрозай пазбаўленьня і гэнае дапамогі.

З праўдзівай завісьцяй прыходзіцца ўглядацца нам, „заходнікам“, на тое, што мае, да прыкладу, маленячкая жменька беларусаў (нейкая сотня тысяч!) у Латвіі. Там, як ведама, істнуюць цьвёрда ўстаноўленыя культурныя бюджэты для ўсіх нацыянальнасьцяў, вызначаныя законам прапарцыянальна да лічбы душ кожнае нацыянальнасьці, і беларусы ведаюць, што ніякія зьмены ўраду, ніякія хістаньні ўрадавае палітычнае лініі ня могуць пазбавіць беларускае насяленьне таго, што ім па праву на здаваленьне культурных патрэбаў належыцца. — У нас-жа — зусім інакш. І мы ніколі ня пэўныя, ці тая дапамога, якую мы дасталі на школы ці іншыя ўстановы ў гэтым месяцы, будзе нам выдадзена ў наступным...

Ясна, што гэткі стан не павінен надалей істнаваць, што з ім мы мусім рашуча змагацца тымі спосабамі, якія нам дае польскае заканадаўства. Але — побач з гэтым — мы мусім зьвярнуць увагу і на яшчэ адзін спосаб дзеля забясьпечываньня нашых культурна-нацыянальных патрэбаў, якім карыстаюцца багацейшыя і лепш з'арганізаваныя грамадзянствы.

Гэта — дапамога культурным установам з боку свайго-ж грамадзянства. Як ня беднае нашае грамадзянства, але, каб ня тая дэмаралізацыя яго, якая паўстала на груньце „дакармліваньня“ з боку чужацкіх „дабрадзеяў“, і яно магло-б з'арганізаваць нейкае самаабкладаньне, нейкі грамадзкі падатак на культурныя справы. Нам успамінаюцца тыя далёкія даваенныя часы, калі малая жменька адраджэнцаў, з трудом зарабляючых на сваё жыцьцё нейкі грош, выдавала бяз ніякіх чужых дапамог свае часопісі, кніжкі і г. д. У тыя часы ня было і гутаркі аб тым, каб сама беларуская справа некага карміла: не, *усе мусілі карміць справу з свае ўласнае кішані!*

Праўда, цяпер часы шмат зьмяніліся. Эканамічны крызіс даецца ўсім у знакі. Дык ці ня гожа было-б беларусам, замест шукаць заработку ў розных чужых хлебадайных установах, распачаць тварэньне такіх эканамічных установаў, якія былі-б і з грамадзкага боку карыснымі для беларускіх масаў, і працаўнікам іхнім давалі-бы магчымасьць і самім жыць, і з свайго заробку падтрымліваць усякія культурна-нацыянальныя пачынаньні.

Мы маем падставу баяцца, што той новы курс у адносінах да беларусаў у Польшчы, які прадвяшчае ўзнаўленьне арганізацыі „казённых полёнофілаў“, паважна пагражае істнаваньню нашых школ і іншых культурных установаў, якія дагэтуль даставалі нейкія крошкі з таго, на што беларускі народ, плоцячы дзяржаўныя падаткі, мае поўнае права, забясьпечанае і польскімі асноўнымі законамі, і міжнародавымі трактатамі. Кожны дзень можа нам прынесьці розныя неспадзяванкі ў гэтай галіне.

Дык тым балей трэба шукаць нейкіх шляхоў дзеля эканамічнага ўнезалежненьня грамадзянства ад зьменных настрояў дзяржаўнае ўлады. А калі мы самі праз сябе будзем эканамічна моцнымі, калі пазбаўляньне нашых культурных установаў належнае ім дзяржаўнае дапамогі ня будзе нас палохаць, дык і кіраўнікам палітыкі Польшчы ня будзе сэнсу біць па нас у такое месца, дзе ўдары ня могуць нам балець.

Ня даём пакуль-што ніякіх канкрэтных праектаў. Кідаем толькі думку, каб нашае грамадзянства, якое можа гэтульки энэргіі марнаваць на нікому непатрэбную зьвягу і грызьню, парупілася скіраваць гэтую энэргію ў бок *эканамічнае самаарганізацыі*.

Задумайцеся над гэтым, хто можа. А пасьля — ад слоў пераходзьце да дзела.

Справа Беларускіх сярэдніх школ у наступным школьным годзе.

З канцом гэтага школьнага году канчаецца права навучаньня ў школе для тых вучыцялёў, якім ня прызнаны так званыя кваліфікацыі. Гэтая справа датычыць што праўда ня толькі вучыцялёў беларускіх школ, бо таму самаму закону падлягаюць і вучыцялі польскіх школ, якіх паводле ўрадовай статыстыкі налічваецца аж каля 200 тысяч, але для беларускага школьніцтва гэтая справа асабліва балюча. Польскія школы яшчэ маюць магчымасьць хоць частку папоўніць прарадзеўшыя кадры свайго вучыцельства новымі маладымі сіламі, якіх дадуць польскія Унівэрсытэты, беларусы-ж і гэтай магчымасьці пазбаўлены, бо ані ўнівэрсытэтаў, ані пэдагогічных беларускіх інстытутаў, як ведама, дагэтуль у Польшчы няма. Мала таго: беларускіх абітур'ентаў (тых, якія кончылі беларускія гімназіі) пачалі прыймаць у Польскія ўнівэрсытэты толькі з восені 1928 году, дык ясна, што пры найлепшых варунках яны змогуць кончыць унівэрсытэт толькі ў 1932 годзе, атрымаюць-жа поўныя кваліфікацыі толькі ў 1934 г. Калі Ўрад будзе чэсна і справядліва падходзіць да гэтага пытаньня, дык зразумела, што павінен прадоўжыць гэты кваліфікацыйны тэрмін для беларускіх вучыцялёў да верасьня 1934 году.

Гэтае нашае разважаньне зьяўляецца чыста фармальным у адносінах да вучыцялёў беларускіх сярэдніх школ, бо калі надыйсьці да гэтае справы па сутнасьці і прыняць пад увагу дабро школы і грамадзянства, дык справу гэтую ў адносінах да ўсіх вучыцялёў трэба было-б разьвязаць зусім іначай.

Трэба ведаць, што гэты закон аб кваліфікацыях, які выкідае са школ з восені 1931 г. каля 2000 вучыцялёў датычыць вучыцялёў 2-х катэгорыяў. І-ая катэгорыя — гэта тыя вучыцелі, якія фактычна маюць кваліфікацыі — пакончалі ўнівэрсытэты ці то расейскія, ці то нямецкія і аўстрыяцкія — г. зн. пакончалі тое самое, што і польскія міністры асьветы і куратары, але з тых ці іншых прычынаў не пасьпелі ці не маглі замяніць свае дыплёмы на польскія дыплёмы ў азначаны час, пасьля якога яны страцілі права на гэта. Гэтыя людзі працуюць у школах Польшчы (ці то польскіх, ці беларускіх або ўкраінскіх і жыдоўскіх) ужо больш як па 10 год. Справа і справядлівасьць вымагае, каб урэшце адчапіліся ад іх з гэтымі фармальнымі прычэпкамі і прызналі ім кваліфікацыі без усялякіх экзаменаў, бо-ж часта яны маюць большыя кваліфікацыі ад тых, хто іх кваліфікуе. Урэшце, калі ўлада зацьверджала іх на пасадах у працягу 10-х гадоў, дык што-ж зьмянілася цяпер? Калі яны дрэнныя вучыцелі, дык праступным было іх трымаць у школе ня то што 10 гадоў, а нат 10 дзён і думаю, што ўлада гэта прыймала пад увагу, калі іх зацьвярджала. Калі-ж яны былі адпаведнымі ў школе ў працягу 10 гадоў дык на 11-м годзе павінны яшчэ больш быць адпаведнымі, бо азнаёміліся і з праграмамі і з польскаю мовою. Хіба вельмі пастарэлі за гэты час, ну але тады так і сказаць — даць эмэрытуру і адправіць іх на спачынак, а не чапляцца да іх з нейкімі кваліфікацыямі.

Другая катэгорыя, — гэта маладыя вучыцелі, якія нат не пакончалі вышэйшых школаў, а дазволена было ім працаваць у школе ў працягу 4-х гадоў. Калі праз 4 гады гэтыя вучыцелі ня здолелі кончыць ун-таў, дык іх трэба бязумоўна ўсіх звольніць, каб даць ім урэшце магчымасьць пакончыць ун-ты, бо ідучы працуючы ў школе яны ня маюць магчымасьці гэта зрабіць. Гэтага вымагае і дабро справы і дабро саміх-жа маладых вучыцялёў.

Эра.

На што бальшавікі узбройваюцца.

На адным сабраньні ў Лёндане выступіў Болдвін, які падкрэсьліваў, што эканамічная вайна, якую вядуць у сучасны мамэнт бальшавікі, пагражае і Англіі, бо прывозячы ў СССР амэрыканскіх і нямецкіх інжынераў ды карыстаючыся да таго яшчэ ў сябе дома прымусовай працаю, наваднююць Англію таннымі таварамі.

Сучаснае палажэньне СССР, кажа Болдвін, ня можа ня выклікаць пачуцьця трывогі, бо ў той час, як уся Эўропа вядзе гутаркі аб разбраеньні, Савецкая Расея, узбройваецца, можна сказаць, да зубоў. Чаму гэта так дзеецца? Ніхто-ж здаецца ня зьбіраецца нападаць на СССР. Усе гутаркі саветаў аб нейкай падрыхтоўцы да вайны з імі — гэта найчысьцейшая выдумка. Гэта добра ведаюць заправілы Расеі і калі, незважаючы на гэта, яны так ліхарадачна ўзбройваюцца, дык гэта ня можа ня выклікаць самага паважнага і сур'ёзнага непакою з боку тых, хто сапраўды клапоціцца аб міру.

На падставе прамоваў Сталіна Болдвін даводзіць, што „пяцілетка“ задумана і праводзіцца ў жыцьцё выключна з мэтай выклікаць ўсесьветную рэвалюцыю.

На заканчэньне Болдвін кажа: „ніхто ня імкнецца ўмешвацца да ўнутраных спраў Савецкае Расеі, але нельга ня сьцьвердзіць, што сучасны савецкі рэжым зьяўляецца абсалютным запярэчаньнем традыцый свабодных народаў. Гэта дыктатура кучкі абсолютыстаў, якія апіраюцца выключна на іншых“!

Сэсія Рады Лігі Нацыяў.

Барацьба за... «незалежнасьць» Аўстрыі.

18 траўня адчынілася чарговая сэсія Рады Лігі Нацыяў.

Галава англійскай дэлегацыі Гэндэрсон, які паставіў на павестку сэсіі справу мытнай уніі Аўстрыі з Нямеччынай, у кароткай прамове высьвятліў, што справа гэта выклікала ў заінтэрэсаваных дзяржавах трывогу, ці гэты крок Аўстрыі і Нямеччыны не нарушае міжнародавыя трактаты, гарантуючыя поўную дзяржаўнай і гаспадарчай незалежнасьці Аўстрыі? Таму ён прапануе Радзе, каб тая зьвярнулася да Міжнародавага Трыбуналу Справядлівасьці ў Гаазе з прозьбай высьвятліць — *з пэўнага боку* — гэтае пытаньне дый — чым хутчэй.

Калі Рада атрымае чыста юрыдычную апінію судзьдзяў найвышэйшага міжнародавага суду ў Гаазе, тады ўжо яна займецца палітычным бокам справы — зробіць тую ці іншую пастанову.

Пасьля Гэндэрсона выступіў аўстрыяцкі міністар Шобэр, (які поруч з Курцыусам стварыў гэтую ўнію), у доўгай, дасьціпнай прамове ён даводзіў, што аўстрыяцка-нямецкая ўмова зусім не пярэчыць падпісаным Аўстрыяй міжнародавым трактатам, бо датычыць толькі гаспадарчых

(гл. на адвароце)

стасункаў з сваей суседкай. Дый дзіўна. што дзяржавы бароняць незалежнасьць Аўстрыі ад... яе самой, забараняючы ей карыстацца поўняй гэтай незалежнасьці ў яе ўласных інтэрэсах.

Дык выходзіць хутчэй, што якраз гэтае ўмешваньне дзяржаваў у жыцьцёвыя гаспадарчыя інтэрэсы Аўстрыі, а зусім не яе вольная мытная ўнія з Нямеччынай. выразна супярэчыць тэй яе дзяржаўнай незалежнасьці, якую маюць задачу бараніць і гарантаваць трактаты. Аднак аўстрыяцкі міністар згадзіўся з прапазыцыяй Гэндэрсона — перадаць справу на *праўны* разгляд міжнародаваму трыбуналу ў Гаазе.

Шобэр дадаў, што Аўстрыя — згаджаецца— не рабіць ніякіх далейшых крокаў на шляху зьдзейсьненьня ўніі, пакуль Гаагскі Трыбунал ня дасьць сваей анініі, а Рада Лігі ня высьветліць свайго стасунку да справы.

Пасьля Шобэра выступіў італіянскі міністар Грандi, які так сама згадзіўся паслаць справу на праўны разгляд у Гаагу. Падтрымаў прапазыцыю Гэндэрсона і Брыян. Пасьля выступіў з вялікай прамовай нямецкі міністар Курцыус, які вельмі востра бараніў вольнае права Аўстрыі карыстацца сваей незалежнасьцяй у яе найважнейшых гаспадарча-жыцёвых інтэрэсах, бараніў ад... няпрошаных „абаронцаў яе незалежнасьці“, якія фактычна якраз абмяжоўваюць гэтую незалежнасьць Аўстрыі... Курцыус згадзіўся зьвярнуцца да Гаагскага Трыбуналу за праўнай апініяй, але дадаў, што Нямеччына не дапусьціць палітычнага разгляду справы мытнай уніі ў Радзе Лігі, які — „можа толькі непатрэбна папсаваць добрыя стасункі паміж дзяржавамі“.

Чаму? А таму, што і Нямеччына і Аўстрыя зразумелі-б такую дыскусію, такое накіданьне ім дзяржавамі сваей волі, як „прызнаньне Нямеччыны і Аўстрыі дзяржавамі з абмяжаванымі правамі“...

У выніку дыскусіі рада пастанавіла — зьвярнуцца да Міжнародаваго Трыбуналу ў Гаазе, каб той у сьпешным парадку высьветліў, ці мытная ўнія Аўстрыі з Нямеччынай супярэчыць падпісаным Аўстрыяй трактатам і ўмовам ці не..

Трэба думаць, што Гаагскі Трыбунал ня знойдзе праўнай супярэчнасьці ўніі трактатам: пэўне-ж найлепшыя праўнікі Нямеччыны і Аўстрыі ведалі, як трэба было ўлажыць „пратакол“ аб уніі. Але пакуль Гаагскі Трыбунал будзе разглядаць справу, дзяржавы, ня трацючы часу, пэўне будуць абрабляць Аўстрыю, каб сарвала ўмову з Нямеччынай. Дый якраз у дзень разгляду гэтай справы ў Радзе — 18 траўня — камітэт дзяржаў, гарантуючых пазыку Аўстрыі, пастанавіў даць Аўстрыі пазыку ў 150 мільёнаў шылінгаў.

Такім чынам — паміж дзяржавамі былой Антанты і Нямеччынай распачалася вельмі характэрная барацьба за... „незалежнасьць“ Аўстрыі...

Гаспадарчы стан Польшчы.

Газэты падалі чарговую месячную справаздачу Варшаўскай Прамыслова-гандлёвай палаты — аб гаспадарчым палажэньні ў краі. Справаздача датычыць, праўда, толькі вокругу Варшаўскай Палаты, але, як кажуць аглядчыкі гаспадарчага жыцьця ў газэтах, дасьледы яе аднолькава тасуюцца і да ўсяго абшару Польшчы.

Справаздача кажа, што красавік ня прынёс з сабой паляпшэньня палажэньня. Крызіс трывае ўва ўсіх галінах прадукцыі і гандлю. Слабое сэзонавае паляпшэньне толькі наглядалася перад сьвятам (Вялікадня).

Агульне зьявішча — гэта паўсюднае зьбядненьне грамадзянства: купляюцца пераважна толькі танейшыя тавары, дый то — пераважна з прадметаў першай патрэбы. Абяцаная ўрадам 15 працэнт. зьніжка пэнсіяў урадоўцам (зрэалізаваная ад 1 траўня) адбілася вельмі цяжка на гандлі — нават прадметамі першай патрэбы. У параўнаньні з 1930 г. зьмяншэньне дасягае 20—30 проц.

Значны ўплыў на пагоршэньне агульнага гаспадарчага стану мела і спозьненая вясна.

«Зялёны Штандар», орган аб'яднанай «Людовай Партыі» ў Польшчы дае абраз гаспадарчага палажэньня вясковай сялянскай Польшчы.

«Вёска ў Польшчы ператварылася з гаспадарчага пагляду ў нейкую вялікую разваліну. Вясковая гаспадарка дае толькі страты. Хто меў яшчэ сякія-такія схаваныя на чорны дзень грошы, той неяк ператрываў; хто ня меў, улез у даўгі, папаў у кабалу к ліхвярам. Цяпер трэба працаваць на ральлі, — трэба папраўляць усякія прылады. Але на гэта ўжо нямашака грошаў. Няма грошаў — ані на вопратку, ані на боты... Няма грошаў на зялеза, дык шмат дзе варочаюцца да драўлянай сахі і бараны — нават былыя заможныя гаспадары. А тым часам трэба плаціць падаткі — ўрадавыя ды самаўрадавыя, якія спаганяюцца гвалтам... Прадаць ужо няма чаго... Як дацягнуць да новага збожа, няведама. Крэдыту ўжо няма — вычарпаны. Зарабіць так сама няма дзе... Ліцытацыі ды эгзэкуцыі — ня выходзяць з чаргі дня... Адзіны ратунак у тым, што ліцытацыі найчасьцей канчаюцца бяз скутку: ніхто ня ідзе купляць... Адзіная пацеха ў тым, што ўжо... — так блага, што горш ужо ня можа хіба-ж быць. Вось палажэньне вёскі»...

Орган польскага сялянства заклікае да апрацаваньня якога пляну ратаваньня вёскі ад поўнага заняпаду.

ПАЛІТЫЧНАЕ ЖЫЦЬЦЁ.

Польшча.

Урад і Сойм.

Палітычнае жыцьцё ў Польшчы блізу цалком замёрла. У прэсе ідуць гутаркі аб тым, быццам урад мае яшчэ ў траўні, ці на пачатку чэрвеня склікаць новую надзвычайную сэсію парляманту. Сэсія гэта, як і папярэдняя, мела-б выразна і точна абмяжаваную праграму працаў.

Новая сэсія, як думае прэса, мела-б на сваей павестцы выключна ўрадавы праект аб новым Статуце для дзяржаўных урадоўцаў, якім урад быццам мае крыху „падрэзаць крыльле“, больш падпарадкаваўшы іх „волі начальства“... Справа аб новай сэсіі дагэтуль яшчэ ня вырашана ўрадам.

Паварот дэлегацыі польскіх прамыслоўцаў з СССР.

17 траўня выехала з Масквы дэлегацыя польскіх прамыслоўцаў, якая прабыла ў СССР каля 4 тыдняў, знаёмячыся з станам і патрэбамі прамысловасьці, гандлю дый наагуль гаспадарчага жыцьця СССР.

Галава дэлегацыі, павадыр буйнейшых прамыслоўцаў Польшчы п. Вежбіцкі, на разьвітальным банкеце горача дзякаваў прадстаўнікам радавае ўлады за „выняткавую гасьціннасьць ды ветлівасьць“, з якой была прынята імі польская дэлегацыя. „Пат“ толькі ня кажа, з якімі канкрэтнымі вынікамі выехалі дамоў польскія прамыслоўцы, якія заказы вязуць яны з сабой з Масквы.

Хваля забастовак.

Газэты пішуць, што «хваля забастовак залівае Польшчу» («Кур. Варш.» — 21-51). «Роботнік» тлумачыць выбух забастовак аднэй агульнай прычынай: „усе забастоўкі, піша ён, вялікшыя ці малыя, маюць адзіную падставу — эканамічную. Усюды прычына — зьмяншаньне платы, звальняньне работнікаў, недатрыманьне кантрактаў, пагоршаньне варункаў працы. Усе забастоўкі, кажа «Роботнік», маюць характар масава-стыхійны, ідучы «з долу». Роля работніцкіх саюзаў зводзіцца да ўтрыманьня дысцыпліны, парадку дый да пасрэдніцтва між работнікамі і працадаўцамі. «Роботнік» лічыць гэтыя забастоўкі вельмі грозным зьявішчам, прычыны якога трэба чым хутчэй зьліквідаваць, каб папярэдзіць магчымасьць «стых йнага выбуху абурэньня галадаючых ад безрабоцьця масаў».

Тое-ж самае сцьвярджае орган польскіх «урадавых сацыялістаў-рэвалюцыянераў» «Валька» (Барацьба), які піша, што яго партыя — поруч з усімі іншымі работніцкімі арганізацыямі на ўсіх вугальных абшарах Польшчы (за вынятка́м толькі Шлёнску) — арганізавала забастоўку вуглякопаў, якая таму і сталася агульнай. Забастоўка, кажа газэта, мела мэту — «зламаць апор ды прагавітасьць вугальных баронаў»...

У часе вугальнай забастоўкі ў Яважыне мелі месца крывавыя сутычкі бастуючых з паліцыяй, якая, як кажа афіцыяльны камунікат, змушана была ўрэшце пусьціць у ход карабіны. У выніку страляніны — некалькі ахвяраў. У хаўтурах забітых таварышоў прынялі ўчасьце каля 5.000 работнікаў. Хаўтуры адбыліся спакойна.

С. БАРАНСКІ.

НЕАДБЫТЫЯ ХАЎТУРЫ.

(Даканчэньне).

Грамада не расхадзілася.

Калі Галуб вылез на бераг, апынуўся зараз ля Рыгаровіча. Упёршыся пад бокі, кінуў бліскавічна ненавісны пагляд і працадзіў праз зубы:

— Ты што гэта?

Рыгаровіч адказаў звонкім, шчырым сьмехам.

— Ты не рагачы. Што тут сьмешнага? ці тое, што ўсю вёску зьвёў? Засьмяешся іначай, калі дастанеш ад мяне па зубах! І — ступіўшы крок наперад — патрос кулаком Рыгаровічу перад самым носам.

Гэты рух выразна неспадабаўся Рыгаровічу, бо, доўга не чакаўшы, піхнуў ад сябе нападаўшага так, што Галуб, лятучы назад і нясьведама маніпулюючы рукамі дзеля ўтрыманьня раўнавагі, з трудом утрымаўся на нагах.

Галуб сябе тут пачуў моцна пакрыўджаным і вырашыў зразу, што найкырысьней будзе адклікацца да грамадзкай справядлівасьці. Паправіў шапку і паднятым голасам прамовіў:

— Суседзі, вы бачыце гэтага вырадка? Мы яго ратавалі ад сьмерці, пакідалі сваю пільную працу ў полі, у хаце, а ён цяпер во што! Піхае мяне, біць хоча і пэўне біў-бы і забіць мог-бы, каб не баяўся гэтай вялікай грамады. І каго? Мяне, што першы ляцеў яму на помач, першы падаў думку невад закінуць. Але ня толькі сябе я тут бараню. Ён-жа зьвёў вас усіх! Падумайце самі. Ён закпіў з усей вёскі. Я пэўны, што зрабіў гэта сумысля. На зьдзек над вамі ўсімі, кінуў свой капялюш на возера і адапхнуў лодку, каб толькі злосна зажартаваць з вас усіх добрых, жычлівых суседзяў, што як дурныя ляцелі яго ратаваць, а прынамся знайсьці і па хрысьціянску пахаваць, ня даць яго рыбам і ракам жорці. Дык ці ж нам усім ня сталася нячуваная крыўда? Ці Рыгаровіч не павінен быць пакараны?

— Падаць яго ў суд! — адазваўся нехта.

— Што тут суд паможа? — цягнуў далей Галуб — гэта справа свая, чыста суседзкая.

— Усыпаць яму з дзесяток розаг і то нагола! — запрапанаваў Яська.

Кабеты і дзяўчаты пачалі нязаметна аддзяляцца ад грамады і адхадзілі групкамі ў кірунку вёскі. Некатарыя пробавалі адвадзіць мужчын у бок і нагаварывалі да хаты. Асьцеражнейшыя, што ведалі, як караецца самасуд законам, нічога ня кажучы, знікалі, хоць мелі вялікую ахвоту прыняць удзел у пакараньні Рыгаровіча, аб якога віне перад выступленьнем Галуба нікому ў галаву ня прышло. Цяпер кожны пачуваўся пакрыўджаным. Што ўсё гэта было прыпадкова— ніхто Рыгаровічу не хацеў верыць. А ўрэшце абвінавачаны ня меў ніякай ахвоты апраўдывацца. Глядзеў на прысутных з пэўным ценем пагарды і не пераставаў сьмяяцца. Гэта аканчальна раздражніла больш гарачых хлапцоў, і ўжо ня было сумніву, што пакараць трэба. Ня было толькі высьнена, ці Рыгаровіча пачаставаць розгамі, ці пакупаць у возеры. Цяпер толькі станавілася Рыгаровічу ясна, што ненавісьць Галуба заразьліва перадалася ўсім прысутным, і што можна ратавацца толькі ўцяканьнем. Агляну́ўся кругом, быццам хацеў выбраць і прачысьціць сабе дарогу. Пагляд гэты ў лёт злавілі прысутныя.

Першым падскочыў з-заду Галуб. За ім кінуліся іншыя.

— Дык біць, ці купаць? — пачуліся галасы.

Але Галуб не чакаў вырашэньня. У той час, як іншыя трымалі Рыгаровіча, каб ня вырваўся,— Галуб усімі сіламі пёр яго бліжэй да берагу і ў адпаведны мамэнт крэпка таўхануў Рыгаровіча ў плечы.

Пачуўся плеск вады, праклянцьці і сьмех.

Ніхто не хацеў Рыгаровічавай сьмерці, але напужаць быў кожны рад.

Ня было возера вельмі глыбокім, аднак Рыгаровіч убачыў, што немагчыма чакаць на далейшы ход выпадкаў. Перакашляўшы ад набранай у рот вады, кінуўся да лодкі, што блізка стаяла, ускочыў у яе і пачаў шастом адпіхацца ад берагу. Гэтым ураьтаваўся ад далейшага перасьледаваньня.

За хвіліну бераг возера апусьцеў.

Па дарозе да вёскі невялічкімі групамі ляніва цягнуліся ўчасьнікі і сьведкі нязвычайнага выпадку. Той, што наймацней трымаў Рыгаровіча за грудзі, заявіў неспадзявана свайму сябру:

— Напрасна так зьдзекавался над Рыгаровічам; ён. мне цяпер здаецца, зусім невінаваты.

— Невінаваты? Дык нашто-ж ты яго так трос за грудзі?

— Ня ведаю. Як усе, так і я.

— Зрабілі сьвінства. Трэба гэта цяпер неяк адрабіць.

Менш-больш тое самае гаварылі іншыя групкі сялян.

Апошнім ішоў Галуб. Ніхто з ім адзінокімісьці ня меў ахвоты. Крыўду ён сваю памсьціў, перажытыя эмоцыі быццам страсанулі душой, але не здаволілі. Згрызься яшчэ больш. Рабіць ня меў чаго і ня мог сябе прадставіць, як пражыве другую палавіну дня.

— „Хаўтураў у вёсцы ня будзе, хрэзьбінаў ці вясельля так-жа хутка не прадбачыцца“, — праляцела праз думку.

Сеў ізноў на прызьбе, голасна зяўнуў, выцягіваючы рукі, і замармытаў да самога сябе:

— Эх ты, нуда вясковая!

Заграніцай.

У краіне рабства.

На фабрыках маскоўскага округу раскіданы адозвы проці Сталіна. Адозвы выданы правай апазыцыяй, бэронючай сялянскую справу.

„Тысячы сялян высланы ў Сібір, пасаджаны ў вастрогі, расстрэлів юцца ў падвалах Г.П.У.“, кажа адозва. У канцы адозва заклікае мястовых работнікаў, каб тыя ня ішлі ў „штурмавыя калённы“, ні ў „каральныя атрады“ чырвонай арміі, якія радавая ўлада кідае проці сялян, боручыхся толькі за свае правы, за сваё жыцьцё. Калі наша краіна запраўды краіна работніцка-сялянская, кажа адозва, дык ня могуць работнікі расстрэліваць сялян, — сваіх братоў — па крыві ды па працы“...

Весткі з усяго абшару радавых рэспублік кажуць, што ўсюды ідуць страшэнныя крывавыя расправы гэтых „штурмавых калённаў“ работнікаў проці змагаючыхся з калектывізацыяй сялян. Асабліва жорсткія расправы распачаліся цяпер у тых мясцовасьцях, дзе ўлады пастанавілі тварыць вялізарныя „калгасы“, маючыя прадукаваць выключна лён.

Сяляне гэтых сядзіб, баючыся астацца бяз хлеба, адмаўляюцца сеяць выключна лён. Дык улады хапіліся „вернага спосабу“ — масава расстрэліваюць або ссылаюць у Сібір „бунтаўшчыкоў“, а іншых змушаюць да рабскага паслуху.

Гішпанская рэвалюцыя «паглыбляецца»...

У Гішпаніі рэвалюцыйны рух, быццам крэпка ўзяты ў рукі ўрадам, усьцяж неяк паглыбляецца дый вызваляецца з рамак, пастаўленых яму ўрадам. Характэрна, што гэты народны (?) рух знайшоў сабе пакуль-што кірунак, на якім спадзяецца найменш спраціву з боку радыкальнага ўраду. Мы кажам аб тых нападах на каталіцкія кляштары ды касьцёлы, якія цяпер сталі на парадку дня ў Гішпаніі. Як ведама, Гішпанія — клясычны край каталіцка-клерыкальнага засільля, запраўднага панаваньня кліру, які праз усю гісторыю Гішпаніі неяк арганічна ды неразьдзельна зросься з манархіяй. Бо-ж ад яе здабыў такія прывілеі, якіх пэўне-ж ня мае ўжо нідзе інш.

Дык ня дзіва, што гэты манархічны наскрозь, нячувана ўпрывілеяваны, маючы вялізарныя зямельныя дый іншыя маемасьці, каталіцкі клір цяпер — пасьля ўпадку манархіі — падзяляе неяк яе лёс...

Зусім магчыма, а можа і пэўна, што шмат газы падліваюць у гэтыя напады ды падпалы кляштараў і касьцёлаў агенты камунізму. Але трэба прызнаць, што гэтая агентура ўсё-ж мае падрыхтаваны гістарычна грунт. Бо-ж усюды, дзе клір, прапаведуючы беднасьць дый пакору, як цноту, бедным, сам багацее — коштам беднага дый рэлігійна веруючага народу,— там усюды ўрэшце прыходзіць расплата.

Такая расплата, трэба думаць, і адбываецца цяпер у Гішпаніі. Характэрна, і што нават сам урад, які быццам прымае рашучыя меры проці наагул недапусьцімых гвалтаў, сам аднак-жа вінаваціць — у выкліканьні народнага абурэньня—вышэйшых прадстаўнікоў каталіцкага кліру. Напр. архіяп. Толедзкі выдаў, як заявіў міністар ун. спраў, нетактоўную адозву — у абарону нейкіх правоў выгнанага караля...

Палажэньне кліру ў Гішпаніі, здаецца значна падобнае да стану ў Мэксыцы, дык трэба думаць, што барацьба проці кліру зацягнецца ды завострыцца яшчэ горш.

Першыя вольныя выбары.

Выбары ў устаноўчы сойм у Гішпанскай рэспубліцы назначаны на 28 чэрвеня. Міністар унутран. спраў заявіў, што парадак у краі ўжо цалком устаноўлены. Усе спробы нападаў зроблены немагчымымі. З другога боку — усялякая кампанія з боку манархістаў проці новага ладу будзе ўрадам карацца з найвышэйшай срогасьцяй.

Урад загадаў стварыць камісію, якая займецца апрацаваньнем законапраекту аб шырокай зямельнай рэформе.

Гішпанскі ўрад паважна заняты — разважаньнем дэкрэту аб выдаленьні з краю ўсіх езуітаў, аб чым атрымлівае рэзалюцыі ад розных мясцовых самаўрадаў і палітычных арганізацыяў.

Новы прэзыдэнт Францыі — Павал Думэр.

Новы прэзыдэнт Францускай Рэспублікі Павал Думэр быў у апошні час старшынёй Сэнату. Прафэсар, публіцыст, шматгадовы пасол і сэнатар, шматразовы міністар, былы губэрнатар францускага Індакітаю, п. Думэр належыць да найвыдатнейшых палітычных дзеячоў Францыі. Не аднойчы быў Думэр і старшынёй то тэй ці другой заканадаўчай палаты. Ад часу расейскай рэвалюцыі Думэр стаў на чале камітэту, які арганізаваў тварэньне польскай арміі — на заходнім фронце. Таму новы прэзыдэнт лічыцца асаблівым прыяцелям Польшчы. У сваей кандыдацкай дэклярацыі Думэр заявіў, што яго кандыдатуру ды канкурэнцыю з Брыянам ня трэба разумець так, быццам ён, Думэр, — праціўнік палітыкі міру ды мірнага паразуменьня з Нямеччынай. „Страціўшы сам 3 сыноў сваіх у часе вайны, казаў Думэр, я больш як хто іншы ведаю, што значаць жахі вайны, дык прылажу ўсе сілы, каб папярэдзіць магчымасьць яе паўтарэньня“.

Правал Брыяна на груньце француска-нямецкіх стасункау.

Адбыўшыяся 13 траўня прэзыдэнцкія выбары ў Францыі, на якіх праваліўся якраз „найпэўнейшы кандыдат“ лявіцы — Брыян, а выбраны быў кандыдат правіцы Павал Думэр, зьявілася найвялікшай сэнсацыяй палітычнага жыцьця Эўропы.

Першае галасаваньне ў нацыянальным зборы дало Брыяну толькі 391 голас з 902, а яго канкурэнту — Думэру — аж 432 галасы! Дзеля таго, што для важнасьці выбару кандыдат павінен быў зд быць абсалютную большасьць галасоў, ці ня менш, як 452 галасы, наладжана было другое галасаваньне, у якім аднак-жа Брыян прыняць учасьце ўжо адмовіўся, пабачыўшы, што большасьць сабраньня ўжо выказалася не за яго.

Правал кандыдатуры Брыяна выклікаў у Францыі вялізарнае абурэньня сярод лявіцы—ня толькі буржуазнай, але і сацыялістычнай. Перамога Думэра тлумачыцца тым, што ў францускім парлямэнце дый у краі ўзрастае нездаволеньне Брыянавай палітыкай уступак і лагоднага паразуменьня з Нямеччынай. Францускае грамадзянства ў сваёй большасьці быццам настрашана тэй новай актыўнасьцяй нямецкай палітыкі, якая ўсё больш вызваляецца з-пад каманды пераможцаў. Асабліва настрашыла Францыю мытная ўнія Нямеччыны з Аўстрыяй, як першы крок да поўнага аб'яднаньня, якое ў выніку дало-б Нямеччыне страшэнную перавагу ў Эўропе, пакрываючы зьлішкам усе зямельныя і іншыя страты, прычыненыя Нямеччыне яе паражэньнем у апошняй вайне.

У выніку свайго правалу, Брыян заявіў, што пастанавіў выйсьці ў адстаўку цалком. У Жэнэву паехаў Брыян толькі на сэсію арганізаванай па яго-ж думцы „панэўрапэйскую камісію“. Як галава франц. дэлегацыі і на сэсіі Рады Лігі. Але пасьля перадумаў і астаўся. Ці споўніць Брыян сваю пагрозу — адыйсьці цалком ад палітычнай працы, няведама.

У кожным разе трэба спадзявацца рашучай зьмены ўзаемных стасункаў паміж Францыяй і Нямеччынай: скрытая іх барацьба, так спрытна — з боку Нямеччыны, дый так шляхотна — з боку Францыі лагоджаная дагэтуль мае прыняць формы больш адкрытыя і рэзкія. Нямеччына настолькі ўжо ўмацавалася, што задачу свайго поўнага вызваленьня з-пад каманды сваіх пераможцаў ставіць рубам — ясна і адкрыта. Так сама рубам мае ізноў ставіць Францыя і сваю задачу — утрыманьня Нямеччыны „пад спэцыяльным наглядам“. — Барацьба гэтая можа прыняць вельмі драматычныя формы.

Вэнгрыя трэбуе рэвізіі трактатау.

Перад распачацьцем чарговай сэсіі Рады Лігі Нацыяў у Вэнгрыі адбыліся ізноў вялізарныя дэманстрацыі пад лёзунгам перагляду міравога трактату. Цікаўна, што ў часе маніфэстацыяў у Будапэшце (сталіца Вэнгрыі) выступалі славацкія палітычныя дзеячы, якія — ад імя славацкага народу — трэбавалі злучэньня з Вэнгрыяй і адарваньня Славаччыны ад Чэха-Славакіі, да якой славакі былі далучаны—без запытаньня аб гэтым славацкага народу... Цяжка сказаць, насколькі маюць права гаварыць „ад імя славацкага народу“ гэтыя дзеячы. Але — бясспрэчна тое, што палітыка чэхаў адносна да славакаў, да таго-ж падбураных з заграніцы, значна ахаладзіла „родныя пачуцьці“ славакаў да чэхаў, дый наадварот — прыхіліла неяк славакаў да вэнграў, якіх славакі заўсёды лічылі сваімі заклятымі ворагамі ды катамі... Дык у кожным разе — не на карысьць чэхаў гэтае нават „зьмяншэньне ненавісьці“ да вэнграў у славакаў — пасьля 12-лецьця істнаваньня Чэха-Славацкай дзяржавы... Паважная ў гэтым перасьцярога, дый ня толькі для адных чэхаў... Бо-ж вось у чым запраўдная сіла думкі аб пераглядзе трактатаў!

Край без забойцау!

Дзіўнае зьявішча ў нашыя часы, — барбарызаваныя вайной, імпэрыялістычнымі захватамі чужых краёў на падставе „міру“ дый рэвалюцыямі, прадстаўляе Нарвэгія, край, у якім, як сьцьвярдзіў чарговы адчот яе вастрожнай інспэкцыі, ад 1928 году дагэтуль ня было ніводнага забойства або якога іншага крывавага здарэньня з сьмяротным канцом. Запраўды-ж, Нарвэгія можа лічыцца нячуваным вынятакам, ці „выродкам“ з усяе сям'і так званых „цывілізаваных“ дзяржаў нашых часоў... Справаздача галоўнага інспэктара тлумачыць такое нячуванае паніжэньне праступнасьці ў краі — лепшымі варункамі працы і платы, агульным дабрабытам насяленьня, грамадзкай арганізацыяй паліцыі, агульным узростам культурнасьці насяленьня, галоўнае — высокай цьвярозасьцяй народу.

Каротнія навіны.

— У Беластоку зачыніўся хаўрус буйных прамыслоўцаў (цяжкой прамысловасьці). Прычына — банкруцтва шматлікага з сяброў Саюзу. Факт гэты сьведчыць аб далейшым разьвіцьці гаспадарчага крызісу ў нашым краі.

— У львоўскай украінскай часопісі «Сельроб» надрукавана, што ў 1928 г. кіраўнікі украінскай коопэрацыі ў Польшчы, пасол Луцкі і сэнатар Павлікоўскі, падпісалі ўмову з прадстаўнікамі радавай украінскай коопэрацыі, прычым атрымалі беспрацэнтную пазыку ад украінскага КООПРУ ў Бэрліне ў суме 50.000 даляраў. Умова прадбачыла:

1. дастаўку розных радавых тавараў — на вельмі выгадных варунках для патрэбаў украінскай коопэрацыі ў Польшчы;
2. стварэньне ў Коопэратыўным Інстытуце ў Кіеве і ў Тэхнікумах коопэратыўнай веды ў Радавай Украіне 20 стыпэндыяў для ўкраінскай моладзі з Польшчы;
3. дастаўку папулярна-гаспадарчай літэратуры радавых выданьняў для пашырэньня сярод украінскага сялянства, і
4. сталую сувязь між коопэрацыямі абодвух краёў — шляхам узаемнага ўчасьця ў коопэратыўных зьездах і т. д.

Польскія газэты абураюцца за такую ўмову на ўкраінскіх павадыроў, трэбуючы „прыняць меры“ і т. д.

— Як падае прэса, на Савецкай Украіне пашыраецца забастоўка сельскіх работнікаў, якая ахоплівае землярobскія камуны (калхозы). Сябры калхозаў, якіх гаспадаркі перад гэтым былі сканфіскаваны, — адмаўляюцца працаваць да часу, пакуль ім ня зьвернуць сканфіскаваных савецкаю ўладаю гаспадарак. Выходзячая ў Кіеве „Пралетарская Праўда“ падае да ведама, што ў м-ку Княжычы, у Кіеўшчыне, забаставала каля 1000 сялян, належачых да мясцовай камуны. Часопісь заяўляе, што землярobская забастоўка выклікана контррэвалюцыянерамі, якія гэткім спосабам хочуць перашкодзіць у правядзеньні веснавых пасеваў. Арыштаваны 7 вучыцялёў і больш 10 сялян; закідаюць ім удзел у забастовачнай агітацыі.

— За першыя 3 месяцы з Польшчы ў СССР было вывезена ўсяго тавараў на 32 зьлішкам мільёны злотых. За той-жа час з СССР у Польшчу было прывезена тавараў толькі на 7,728 тысячы злот.

З Польшчы ішлі ў СССР пераважна машыны ды розныя вырабы мэталёвай прамысловасьці, вопраткі, вугальле, фарбы і г. п. З СССР у Польшчу ўвозяць пераважна рыбу, тытун, жывёлу, лес, лён, паперу, бавоўну і т. п.

— Орган пэпээсаў „Роботнік“ падлічыў, што апошняя яго канфіската зьяўляецца ўжо 128 — за час яго істнаваньня ў адроджанай і вольнай Польшчы.

— На кангрэсе Камуністычнага Інтэрнацыяналу ў Маскве францускі камуніст Кашэн выступіў з прамовай, у якой паміж іншым заявіў, што міжнародны імпэрыялізм стала і няўхільна рыхтуецца да вайны проці Радаў. Распачацьце вайны плянавалася ўжо ў ліпні 1930 г., але па розных прычынах адкладзена на пазьней. Небясьпека гэтай вайны, якая пэўне-ж разрасьцецца ў сусьветную бойню, цяпер быццам актуальна, як ніколі...(?)

— У бліжэйшы час Рада Лігі Нацыяў мае вырашыць справу ўзнаўленьня чыгункавага руху на лініі Ляндварова—Кашэдары.

— Рэвалюцыйны ўрад Гішпаніі выдаў дэкрэт аб канфіскаваньні ўсіх маемасьцяў былага караля Альфонса, які, як высьветліў мін. фінансаў, пачаў так гандляваць астаўшыміся ў краі „сваімі“ маёнткамі, што гэта пагражала сталасьці гішпанскай валюты.

КАРЭСПАНДЭНЦЫІ

Помста ў лесе.

(Новы-Пагост, Браслаўскага павету).

На мінулым тыдні жых. в. Ваўчкі, Нова-Пагостцкай воласьці, малады хлапец Сымон Мароз наскочыў з нячэўку на жых. кал. Высяты, тэй-жа воласьці Сьцяпана Міронава і пацягнуў яму вострым нажом па горле. Лічачы, што апошні ўжо ня жыве, Мароз уцёк, кінуўшы ў кусты свой ножык. На месца бойкі аднак хутка надыйшлі людзі, якія якраз тады былі ў лесе, і пасьпяшылі прынясьці недарэзаную ахвяру да нашага доктара, каторы хутка зашыў разрэзанае месца. Рана аказалася цяжкою, але несьмяротнаю.

Прычынаю гэтага злачынства ёсьць тое, што абодва гэныя хлапцы заляцаліся да аднэй дзяўчыны. Дык вось на грунце зайздрасьці Мароз і дапусьціўся гэнага агіднага, крывавага нападу. Ясна, што справаю зацікавілася хутка паліцыя і Мароза арыштавала, якому пагражае каля трох гадоў вастрогу. Можа гэты прыклад палажыць канец падобным экспэрымэнтам.

Так напіўся, што жыцьця пазбыўся.

(в. Рэпніца, Браслаўскага павету).

Жыхару в. Рэпніца, Нова Пагосцкае воласьці, Язэпу Апольку ня мала давялося на сваім жыцьці дазнаць бяды праз свой нахіл да гарэлкі. Ня гледзячы на тое, што ён меў кавалак зямлі, а да таго яшчэ быў сталяром, — ён заўсёды наракаў, што яму дрэнна жывецца, а дзеля гэтага — праз усё сваё жыцьцё, як казаў, мусіў „прыкладацца“ да чаркі. І рэч зразумелая, што здабывацца на апошняе яму не заўсёды лёгка давалася, маючы на ўтрыманьні аж пяць душ сям'і; дык каб напіцца — яму ня раз даводзілася закладаць карчмару за гарэлку самыя найпатрабнейшыя для яго рэчы, як сякера, гэблік і т. п., чаго пасьля выкупляць і ня думаў.

Але сёлетні год для Апалькі быў годам асабліва цяжкім, бо ў сувязі з грашавым крызісам работы ў сталярні зьменьшылася, закладаць ня было чаго, а збожа так станела, што на бутэльку гарэлкі трэба занясьці аж цэлы пуд. Пры такой дарагоўлі гарэлкі Апольку, паводле ягонае думкі, нічога не заставалася рабіць, як ад „чыстае“ сівухі перакінуцца да „нячыстага“ дэнатурату, які яму, быццам, ня шкодзіў, бо ён умеў яго „фільтраваць“ (ачышчаць). Аднак, як кажуць, да пары збан ваду носіць. 6-V г. г. Аполька так пацягнуў свайго „нэктару“ (гэтак ён называў „фільтраваны“ дэнатурат), што на „фільтраваньне“ самога мусіў прыехаць у вёску сьледавацель з павятовым дохтарам, ды, на жаль, запозна, бо няшчаснага Язэпа працьвярозіць ужо не ўдалося. І там, дзе калісь чутны быў стукат сякеры і іншых сталярскіх прыладзьдзяў, — цяпер можна пачуць толькі плач удавы і сіротаў. Вось да чаго даводзіць п'янства.

Г.

ХРОНІКА

— У Віленскай Беларускай Гімназіі. Пісьменныя матуральныя экзамены ў В. Б. Гімназіі ўжо закончаны. Усяго экзаменавалася 33 асобы (25 вучняў — Віленскіх; 2 вуч. Клецкіх і 6 экстэрнаў). Вусныя экзамены пачнуцца 2 чэрвеня ў 8 гадзіне ран.

— Акружная конфэрэнцыя прадстаўнікоў коопэратываў, якія належаць да Саюзу Кооп. Польшчы, адбылася 17 гэтага мая.

Паміж шмат пытаньняў, якія разважаліся на конфэрэнцыі заслугоўвае на асаблівую ўвагу справа выдаваньня коопэратыўнай часопісі „Spólnota“, якая выдаецца ў Варшаве Цэнтраляй Саюзу. Конфэрэнцыя пастанавіла палавіну часопісі запаўняць мясцовым матар'ялам і друкаваць яго ў беларускай мове. Такім чынам ад чэрвеня 4 старонкі „Spólnoty“ будуць друкавацца ў Варшаве папольску, а 4 старонкі — ў Вільні пабеларуску.

На конфэрэнцыі выбрана Акружная Рада на наступны год. У склад Рады ўвайшлі:

1) Трэпка А. з Вільні; 2) Астроўскі Р. з Вільні; 3) Карабейнік з Маладэчна; 4) Лукьянец з Паставаў; 5) Баркоўскі з Смаргоні; 6) Бэзуспаріс з Ігналіна; 7) Гарэцкі з Вільні; 8) Ясінскі з В..цюн; 9) Шмідт з Дукштаў; 10) Блажэвіч з Лынтуп. Як бачым у склад Рады ўвайшло 5 беларусаў 1 літвін і 3 палякі.

— Страты ад разводзьдзя. Як падлічыла камісія дзеля дапамогі пацярпеўшым ад разводзьдзя, у адным толькі Віленскім ваяводзтве вада нарабіла стратаў ды шкодаў на 4 мільёны з чверцяй злотых.

Найбольш пацярпелі Дзісьненскі і Браслаўскі паветы, дзе страты аблічаны на 2 мільёны зл. У Вільні стратаў на 900.000 зл. у Сьвеньцянскім пав. — стратаў на 250.000 зл., у Віленска-Троцкім — на 213.000 зл., у Маладзечанскім пав. — на 200.000 зл., у Ашмянскім — на 106.000 зл.

— Урачыстасьці ў чэсьць А. Міцкевіча. У чэрвені ў Навагрудку пачнуцца юбілейныя ўрачыстасьці ў чэсьць Адама Міцкевіча.

— Канец тургельскіх падзеяў. У Лідзкім судзе адбыўся працэс Дойлідкі і 8 яго таварышоў, абвінавачаных у нападзе на паліцыянтаў у Тургелях. Разглядзеўшы справу, суд 6 падсудных засудзіў на 1 год катаргі кожнага, рэшту апраўдаў.

— Справа Дзідзюля. 13 траўня ў Віленскім Апэляцыйным Судзе разглядалася справа раднага А. Дзідзюля, вінавачанага ў шырэньні антыдзяржаўных праклямацыяў у часе хаўтураў былага грамадзяніна К. Юхны. Акружны суд засудзіў Дзідзюля на паўтара года вастрожнага заключэньня. Апэляцыйны суд засудзіў яго аж на 5 гадоў катаргі.

— Арыштаваньне камуністаў у Лідзе. Улады арыштавалі ў Лідзе 19 асоб, пераважна 17—20 гадоў, якія вінавацяцца ў прыналежнасьці да раённага камітэту камун. партыі.

— Чырвоны певень. 25-V у вёсцы Міхацелка, Баранавіцкага пав., выбухнуў пажар, які зьнішчожыў з шалёнай шпаркасьцяй 40 хатаў і 36 іншых гаспадарчых будынкаў — разам з зачыненай у іх жывёлай і іншай маемасьцяй. У вагні згінула дзіцё аднаго з гаспадароў. На пажар здолелі падскочыць аж 9 пажарных камандаў: 6 баранавіцкіх ды 3 нясьвіжскіх.

У Шчучынскім пав. таго-ж дня выбухла аж 4 пажары: у Скрыбаўцах пажар зьнішчожыў 6 хатаў і 15 інш. будынкаў — стратаў на некалькі тысяч зл.; у в. Бешакі згарэлі 2 хаты — стратаў на 6,000 зл.; у в. Ванелькі спалілася некалькі гаспад. будынкаў з жывёлай. Будынкі былі застрахаваны ў 3.500 зл., дык думаюць, быццам будынкі былі падпалены, каб атрымаць страхоўку; урэшце ў в. Мілаўцы ад падпалу спалілася 9 хатаў і 29 інш. будынкаў — стратаў на 25 тысяч зл. Падпалячоў арыштавана.

25-V у засьценку Паяўра, Колтынянск. гм. Сьвянцянскага пав. згарэў жылы дом. Стратаў— на 10.500 зл.

У вёсцы Галоўцы, Навагрудзкага пав., спаліліся будынкі Я. Грабоўскага, пры чым у вагні згінулі 3 сыны і дачка Грабоўскага.

У вёсцы Майсеевічы, Лідзкага пав. спалілася некалькі сялянскіх двароў. Стратаў — на 15.000 зл.

Як бачым, чырвоны певень ужо пайшоў гуляць па нашым саламяным краі.

— Чыгункавая катастрофа на станцыі Бязданы. 16 траўня каля станцыі Бязданы здарылася чыгункавая катастрофа. Пасажырскі цягнік наскочыў на таварны. Разьбіліся абодва паравозы дый ушкоджана некалькі вагонаў. Абодва машыністы з памочнікамі і два паштовыя ўрадоўцы — ранены. Пасажыры толькі настрашаны. Стратаў і шкодаў налічана 40.000 зл. Катастрофа выклікана была, як думаюць улады, зумысна замахоўцамі, якія папсавалі стрэлку, пусьціўшы цягнік на іншы шлях.

УЗНАЎЛЕНЬНЕ ПАВЛЮКЕВІЧАЎШЧЫНЫ

Здавалася, што пасьля маёвага перавароту назаўсёды будзе пахаваная тая процібеларуская акцыя, якую пэўныя польскія сфэры вялі з даўных часоў пры помачы Аляксюка, Валэйшы, Павлюкевіча ды Вярнікоўскага. Але гэта толькі здавалася: цяпер гэтая акцыя ўзнаўляецца, толькі на першы плян выпускаецца новы чалавек — *Фабіян Акіньчыц,* былы грамадаўскі юрысконсульт, а пасьля — нейкі час працаўнік нашае часопісі і сэкрэтар Цэнтрасаюзу. Першым крокам узноўленае акцыі зьяўляецца выпуск у сьвет аднаднёўкі пад назовам *„Беларуская Праўда“*.

Гэная „Праўда“ зьяўляецца ўзнаўленьнем павлючковага „Беларускага Слова“ і валэйшаўскага „Грамадзкага Голасу“ і зьмяшчае ў сабе далейшы працяг тае агіднае зьвягі, якую ўжо многа год назад вялі проці найпаважнейшых прадстаўнікоў і тварцоў беларускага адраджэнскага руху так званыя „дэфэнзыўныя дзеячы“, ды да якое пасьля далучыліся хадэкі і „сталінаўскія маладцы“. Галоўнай мэтай усіх гэных процібеларускіх дывэрсантаў ёсьць „зьбіваньне галоў беларускага руху“, перад усім грам. Луцкевіча, Трэпкі, Астроўскага і ўсіх тых, хто вядзе незалежную ні ад якіх чужых „апякуноў“ беларускую палітычную лінію.

Акіньчыцава „Праўда“, ідучы па сьлядох хадэцкай „Крыніцы“ пасадзіўшай ужо раз сваімі даносамі грам. Луцкевіча на Лукішкі, піша новыя даносы на грам. Луцкевіча, Астроўскага і Трэпку. Усю групу беларускіх культурнікаў Акіньчыц вінаваціць у „камунізьме“ і ў тым, што яны „гатовы ўбіць нож у сьпіну“... Польшчы! Інакш кажучы — „не спи, городовой!“ А побач з даносамі — паўтараюцца розныя брудныя закіды, ужо адкінения з усей рашучасьцяй на працэсе Грамады, і абліваюцца гразёй беларускія дзеячы і культурныя ўстановы, згуртаваныя ў Цэнтрасаюзе.

Ясна, што ўваходзіць у палеміку з падобным — з пазваленьня сказаць — „органам друку“ мы ня лічым магчымым. Мусім толькі спраставаць некаторыя інфармацыі аб адносінах паміж панам Акіньчыцам і Цэнтрасаюзам.

Пасьля выхаду свайго з вастрогу ўсьлед за Тарашкевічам, Мятлой і іншымі засуджанымі ў сваім часе грамадаўскімі дзеячамі, Акіньчыц прытуліўся да групы беларускіх культурнікаў грамадаўскага кірунку. Дый так лоўка патрапіў марочыць даверчывых людзей сваім „культурніцтвам“, што пры арганізацыі Цэнтрасаюзу здолеў заняць адказнае становішча сэкрэтара Галоўнае Рады Цэнтрасаюзу. Але на практыцы вельмі хутка выявілася, што Акіньчыц, чалавек у беларускім руху зусім няведамы, нічога супольнага з культурнай працай ня мае і мець ня хоча, што сваё становішча ў Цэнтрасаюзе ён выкарыстывае нясумленна адно дзеля таго, каб, ідучы па сьлядох нябожчыка Гурына, распраўляцца за свае асабістыя крыўды з камуністамі і камунізуючымі. Усю культурную працу Цэнтрасаюзу Акіньчыц сабатаваў, стараючыся ператварыць гэтую ўстанову ў нейкую палітычную крамку. Распачатую Цэнтрасаюзам лекцыйную акцыю на вёсцы папросту пахаваў, ператвараючы свае лекцыі на чыста гаспадарчыя тэмы — у палітычныя выступленьні ў яўна фашыстаўскім духу. Пад фірмай Цэнтрасаюзу рассылаў свой агідны па форме пасквіль проці грам. Тарашкевіча і, карыстаючыся падтрыманьнем процібеларускіх дывэрсантаў з „Беларускае Крыніцы“, пачаў агідную правакацыйную зьвягу проці дзеячоў, згуртаваных ў Цэнтрасаюзе. Рад груба неэтычных паступкаў, учыненых Акіньчыцам на гэтым грунце, меў сваім вынікам тое, што Акіньчыц быў прымушаны пакінуць сваё становішча сэкрэтара Цэнтрасаюзу, а агульны сход Беларускага Дабрадзейнага Таварыства, адбыты 3 мая 1931г., абвясьціў вычарпаным мандат Акіньчыца, як сябры Цэнтрасаюзу, рэпрэзэнтаваўшага гэтае Таварыства. Яшчэ перад тым разьвіталася з Акіньчыцам рэдакцыя нашае часопісі, спыніўшы друк ягоных „Аграрных тэм“, як я білі працiўнікаў калхознае палітыкі ў Саветах (Прышчэпава і інш. абаронцаў хутароў) і друкаваліся ў нас, як дыскусыйны матэрыял, за зьмест катрага рэдакцыя на сябе адказнасьці не бярэ. Аб гэтым у кожным нумары быў зьмешчаны надпіс пад загалоўкам.

Апынуўшыся гэтак па-за беларускім грамадзянствам, Акіньчыц зьвязаўся з Павлюкевічам, Знамяроўскім і іншымі „дзеячамі“ таго-ж тыпу і, знайшоўшы „можных апякуноў“, якія яго „працу“ фінансуюць, прыступіў да работы, набіраючы падобных да сябе „полёнафілаў“.

Ці Акіньчыц акажацца шчасьлівейшым за Аляксюка, Валэйшу і Павлюкевіча, — трудна судзіць. Уся яго надзея, здаецца, грунтуецца на „ціхім падтрыманьні“ з боку кс. Станкевіча, які адкамандзіраваў да яго аднаго з сяброў хадэцыі, афіцэра рэзэрвы Казлоўшчыка.

УСЯЧЫНА.

Кароль прамысловец.

Як высьветляецца цяпер, экс-кароль Гішпанскі зусім ня такі дурны, як яго малююць рэспубліканцы. Гэта — манарх новага тыпу, які спрытна скарыстаў з вялікае й сумнае практыкі сваіх скіненых, выгнаных ці забітых калегаў з іншых краёў. Мала рупячыся аб дзяржаўных справах, Альфонс XIII шмат сваей энэргіі аддаваў сваім асабістым гандлёва-прамысловым інтэрэсам! Свае капіталы ён заўсёды пускаў у абарот, купляў землі, дамы, фабрыкі. Такім чынам цяпер яго „асабісты маёнтак“ даходзіць да некалькіх дзясяткаў мільёнаў даляраў. Ён мае вялізарныя зямельныя абшары, заводы і фабрыкі ў Аргентыне дый ў іншых дзяржавах Паўдзённай „Лацінскай“ Амэрыкі. Апроч таго, кароль і каралева не забыліся вывязьці з краю шмат розных каштоўнасьцяў, якія яны лічылі „каралеўскай уласнасьцяй“, але якія ў запраўднасьці трэба лічыць уласнасьцяй дзяржавы ці народу. А яшчэ перад самай рэвалюцыяй — у часе сваей падарожы ў Англію прадбачлівы кароль злажыў у Англійскіх банках вялізарныя капіталы — „на ўсялякі выпадак“...

Газэты, падаючы гэтыя факты, параўноўваюць спрытнага гішпанскага манарха з менш спрытным расейскім, які, як высьветлілася пасьля рэвалюцыі, зусім ня меў ў замежных банках тых міліёнаў, аб якіх хадзілі да вайны легэнды ў сьвеце.

Толькі што вялікі міжнародны прамысловы хаўрус запрапанаваў спрытнаму каралю-прамыслоўцу Альфонсу Гішпанскаму становішча галоўнага дырэктара з пэнсіяй у ліку 30.000 даляраў у месяц!

Варункі прыйма у Беларускую Дзярж. Сэмінарыю.

Да ўступнага экзамену на І курс Дзяржаўнай Вучыцельскай Сэмінарыі ім. Фр. Багушэвіча ў Вільні можа быць допушчаны той, хто скончыў 7 аддз. пачатковае школы ці 4 кл. гімназіі і ня мае ў дзень 31 жніўня 1931 г. болей 16 год.

Кантрольныя экзамены адбудуцца ў гэтым годзе 25, 26 і 27 чэрвеня з наступных прадметаў: 1. Польскае мовы (пісьменны — дыктоўка і вусны — чытаньне, апавяданьне і граматыка ў засягу праграмы пачатковае школы), 2. Беларускае мовы (пісьменны і вусны — так сама, як з польскае мовы), 3. Арытмэтыка (вусны і пісьменны — задачы на ўсе чатыры дзеяньні з звычайнымі і дзесяткавымі дробамі а такжа працэнтныя аблічэньні, 4. Здольнасьці слуху (сьпеў)

Заявы аб дапушчэньні да экзамену прыймаюцца ў канцэлярыі Сэмінарыі да 23 чэрвеня г. г. уключна.

Да заявы трэба далучыць: 1) мэтрыку нараджэньня, 2) уласнаручна напісаны жыцьцярыс, 3) пасьведчаньне аб паўторным прышчэпе воспы, 4) апошняе школьнае пасьведчаньне, 5) дзьве фотаграфіі.

Перад дапушчэньнем да экзаменаў адбудзецца лекарскі агляд стану здароўя, кандыдатаў(так) дзеля сьцьвярджэньня здольнасьцяў, патрэбных для вучыцельскай прафэсіі.

УВАГА: Усялякія фізычныя калецтвы, як вонкавыя, так і ўнутраныя хваробы, напр. сухоты а таксама недахопы ў мове, будуць station ўчай перашкодай у прыйме ў Сэмінарыю.

Сэмінарыя — коэдукацыйная (мяшаная). Пры Сэмінарыі істнуюць інтэрнаты для хлапцоў і дзяўчат. Найздальнейшыя, а незаможныя вучні могуць рабіць захады аб атрыманьні ўрадовай стыпэндыі ў суме 40 зл. месячна. Аплата ў інтэрнатах выносіць 60 зл. у месяц. Плата за навуку 20 зл. у паўгодкі. Апроч таго 2 зл. у паўгодкі за лекарскую помач.

Кандыдаты(кі) на ІІ курс будуць прыймацца выключна восеньню (паміж 15—30 жніўня г. г.).

...Вільня, Завальная вул. № 32